**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2021 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках раённага рэкламнага тыдня «Пошук уласнага іміджу»

У бібліятэках ДУК прйшоў раённы рэкламны тыдзень «Пошук уласнага іміджу», у рамках якога шэраг бібліятэк правялі Дні самакіравання: «Я - сёння бібліятэкар», «Библиотекарь – значит креативный», «Чытач за бібліятэчнай кафедрай», «Дублёр-шоу».

**9-12 верасня**

У бібліятэцы прайшоў цыкл мерапрыемстваў «Сокровищница всех богатств человеческого духа». Для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа супрацоўнікі бібліятэкі прадэманстравалі відэаролік рэкламы паслуг, якія прадстаўляюцца цэнтральнай бібліятэкай. Прысутныя здзейснілі віртуальнае падарожжа па самым незвычайным бібліятэкам свету. У завяршэнні мерапрыемства гасцям раздадзены рэкламныя буклеты з правіламі карыстання бібліятэкай, абыходжання з кнігай і парады для карыснага чытання.

ЦРБ, 79 чал.

**17 верасня**

Весела і цікава прайшоў Тыдзень рэкламы ў бібліятэцы. У дзень адчыненых дзвярэй «Библиотека – место, где чтение уместно!» дзеці пазналі шмат новага пра бібліятэку. З дапамогай відэапрэзентацыі ўсе разам здзейснілі віртуальнае падарожжа па бібліятэках розных куткоў планеты.

Арганізавана выстава-прынада «Приходи почаще! Библиотечные книжки скучают без тебя». Аматары чытання ўспаміналі свае першыя кнігі, чыталі вершы, адгадвалі загадкі. Усе атрымалі салодкія прызы.

Загадчыца запрасіла навучэнцаў чацвёртых класаў на сустрэчу сяброў бібліятэкі «Моя читательская биография». Аматары кніг з задавальненнем адказвалі на пытанні конкурсаў «Кто здесь живет?», «Почтовый адрес», «Доска объявлений» і вясёлых віктарын «Ромашка», «Друзья героев сказок», «Музыкальный». Дзеці ўспаміналі назвы і аўтараў твораў, літаратурных герояў і цікавыя дэталі іх жыцця, выяўлялі сваю кемлівасць.

Гарадзецкі філіял, 85 чал.

**20 верасня**

У бібліятэцы прайшла акцыя «Читательская ленточка». Наведвальнікам бібліятэкі прапанавалася ўпрыгожыць дрэва шматкаляровымі стужачкамі, з дапамогай якіх выяўляліся чытацкія перавагі. Колер стужачкі адпавядаў пэўнаму літаратурнаму жанру. Лідарамі чытання сталі казкі, кнігі пра прыроду і часопісы. Цікавасць выклікала выстава-прагляд «Самая, самая,

самая» - самая разумная, вясёлая, маленькая, вялікая, тоўстая, тонкая, цяжкая, вялікая, новая, старая кніга.

Арэхаўскай ПБ, 45 чал.

**20 верасня**

На літаратурнае свята «Нас всех объединяет книга» прыйшлі навучэнцы і настаўнікі Тэвельскага дзіцячага саду-пачатковай школы. Прыхільнікі кнігі і бібліятэкі пазналі ў чым сакрэт бібліятэчнай працы. Казачныя персанажы Баба Яга, Бураціна і Мальвіна правялі цікавыя конкурсы «Отгадай название народной сказки», «Путешествие в Читай-город», «Доскажи словечко» і інш. Самыя начытаныя і кемлівыя атрымалі салодкія прызы.

Тэвельская ПБ, 35 чал.

## Мерапрыемствы да Дня народнага адзінства

**1 верасня**

У рамках моладзёжнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» ў бібліятэцы сабраліся навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа на першы ўрок, прысвечаны Дню ведаў «Адзінства беларускага народа - аснова незалежнай краіны».

Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі аб з'яўленні новага дзяржаўнага свята - Дня народнага адзінства, прысвечанага ўз'яднанню заходніх і ўсходніх беларускіх земляў у 1939 годзе, аб доблесці і мужнасці, гераізме і згуртаванасці беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Навучэнцы ўпэўнена адказвалі на пытанні віктарыны «Гонар Беларусі». Мерапрыемства суправаджалася паказам відэароліка «Сэрца зямлі маёй».

ЦРБ, 77

**16-18 верасня**

У рамках агульнарэспубліканскай культурна-патрыятычнай акцыі «Беларусь - краіна адзінства» ў бібліятэцы прайшоў літаратурна-музычны вечар «Беларусь: у сугуччы мінулага з сучаснасцю» і вусны часопіс «Беларусь. Радзіма. Адзінства».

Літаратурна-музычны вечар «Беларусь: у сугуччы мінулага з сучаснасцю» для вучняў 9 і 10 класаў СШ № 8, № 1 г. Кобрына пазнаёміў вучняў з гісторыяй узнікнення новага дзяржаўнага свята - Дня народнага адзінства. Навучэнцы актыўна адказвалі на пытанні віктарыны «Гонар Беларусі», «Славутыя людзі беларускай зямлі», прагледзелі відэаролік «Сэрца зямлі маёй».

Падчас вуснага часопіса «Беларусь. Радзіма. Адзінства» вучні 9 класаў СШ № 9 г. Кобрына здзейснілі віртуальнае падарожжа па вядомых мясцінах Беларусі, адкрылі для сябе мноства цікавых фактаў пра гісторыю, культуру і архітэктуру краіны, адказалі на пытанні віктарыны «Дасягненні Беларусі», раскрылі паняцці: «адзінства», «згуртаванасць», «салідарнасць», «узаемаразуменне». Завяршылася мерапрыемства знаёмствам з выставай «Адзінства беларускага народа - аснова Незалежнай краіны».

ЦРБ, 73 чал.

**17 верасня**

Падчас круглага стала для моладзі «В единстве народа – сила государства» бібліятэкар пагутарыла з дзецьмі пра новае дзяржаўнае свята. Настаўнік гісторыі Залескай СШ В. І. Шапяцюк напомніла дзецям пра гістарычныя падзеі, што папярэднічаюць уз'яднанню Заходняй і Усходняй Беларусі, пра жыццё простых беларусаў пад уладай Польшчы. І. І. Атветчыкава, настаўнік геаграфіі Залескай СШ, расказала, як класікі беларускай літаратуры апісваюць падзеі таго часу. У другой частцы мерапрыемства маладыя людзі прадэкламавалі любімыя вершы пра Беларусь, родны край і свет.

Залеская ПБ, 33 чал.

**20 верасня**

Патрыятычны ўрок «Одной единою семьей» паведал дзецям пра новае дзяржаўнае свята, пра гісторыю яго ўзнікнення. Прысутныя праслухалі ўрывак з кнігі ўспамінаў А. А. Гапановіча пра падзеі восені 1939 г., адказалі на пытанні віктарыны «Што ты ведаеш пра Беларусь?», здзейснілі відэападарожжа па любімых месцах малой радзімы. Наталля Пушыла выканала песню пра родную зямлю на словы мясцовай паэткі Надзеі Момлік.

Дзівінскі філіял, 39 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**3 верасня**

У публічным цэнтры прававой інфармацыі на базе бібліятэкі адбылося бясплатнае прававое кансультаванне. Бясплатныя прававыя кансультацыі рэгулярна праводзяцца натарыусамі ў рамках сумеснага праекта ПЦПІ Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва».

ЦРБ, 15 чал.

**4-7 сентября**

Праведзены цыкл мерапрыемстваў «Вершапад па-беларуску», прысвечананы Дню беларускага пісьменства. Гасцямі і ўдзельнікамі мерапрыемства сталі вучні ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Кобрына», навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага прафесіянальнага ліцэя сферы абслугоўвання, якія даведаліся аб узнікненні пісьменства і кнігадрукавання на Беларусі. Вядучыя паведамілі пра святкаванне Дня беларускага пісьменства ў гэтым годзе ў Копылі Мінскай вобласці, распавядалі пра адметныя падзеі ў гэтыя дні. У другой частцы праграмы госці гулялі ў паэтычнае лато «Вершапад па-беларуску», чытаючы вершы беларускіх паэтаў на пэўныя тэмы. Да гульні далучыліся і кобрынскія паэткі – члены літаратурнага клуба «ПаэтыКо» Марына Міхалюк, Наталля Кандрашук і Алена Котава, якія прапанавалі ўвазе гледачоў асабістыя творы.

ЦРБ, 117 чал.

**23-30 верасня**

У рамках прафілактыкі суіцыдальных паводзін сярод моладзі для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа і вучняў старэйшых класаў СШ № 1 г. Кобрына прайшоў цыкл мерапрыемстваў «Ценность моей жизни». Айцец Андрэй з царквы Святога нараджэння Хрыстова правёў гутарку пра сэнс чалавечага жыцця, аб маральных каштоўнасцях, аб адносінах царквы да самагубства. Урач-валеолаг Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева распавяла пра прычыны самагубства і фактарах рызыкі, пра тое, ці можна прадухіліць самагубства і як дапамагчы чалавеку, які трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Взгляни на жизнь по-новому! ».

ЦРБ, 109 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

Да 75-годдзя з дня нараджэння вядомага дзяржаўнага дзеяча, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь М. І. Дземчука бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі падрыхтаваны і выдадзены біябібліяграфічны паказальнік «Навуковец, кіраўнік, дзяржаўны дзеяч» з серыі «Асоба ў гісторыі малой радзімы».

Да 60-годдзя з часу заснавання Кобрынскай сельгастэхнікі (цяпер ААТ «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання») бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавана нфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «”Айбаліты” сельскагаспадарчай тэхнікі» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада».

Да 75-годдзя з часу заснавання Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Захавальнік гісторыі зямлі кобрынскай» з серыі «Ведай і любі свой горад».

Праект «Славутыя імёны маёй малой радзімы» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі на сайце ДУК папоўніўся новымі матэрыяламі.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81